# Р А З Д Е Л 5
# ВНЕШНЯЯ ПОЛИТИКА И ДИПЛОМАТИЯ БЕЛАРУСИ (1918–2019 гг.)

## ДЗЕЙНАСЦЬ ГРАМАДСКІХ АБ'ЯДНАННЯЎ У СФЕРЫ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН У 1917–1918 гг. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ МАГІЛЁЎСКАГА БЕЛАРУСКАГА КАМІТЭТА)

А. Р. Агееў, І. А. Пушкін (Магілёў)

Рэвалюцыя 1917 г. абудзіла да грамадскага жыцця беларускую грамадскасць, якая праводзіла мітынгі і сходы, утварала грамадскія арганізацыі і мясцовыя філіі палітычных партый. Грамадскае жыццё віравала, а грамадскія актывісты з радасцю прымалі на сябе адказнасць за лёс народа і краіны. Не абыходзілі яны і пытанні міжнародных адносін. Шматлікія грамадскія аб'яднанні смела і, нават, задужа самаўпэўнена для таго часу лічылі, што яны могуць не толькі заяўляць аб сваіх правах і інтарэсах на міжнароднай арэне, але і рэальна ўплываць на падзеі. Грамадскія аб'яднанні пісалі адозвы, пратэсты, заявы і маніфесты, звярталіся не толькі ў міжнародныя арганізацыі але непасрэдна да тагачасных дзяржаў і дзяржаўных утварэнняў.

Тагачасная актыўнасць грамадскіх аб'яднняў на міжнароднай арэне звязана з тым, што ў канцы Першай сусветнай вайны актывізаваўся працэс стварэння новых нацыянальных еўрапейскіх дзяржаў. Узнікненне дзяржаў было не толькі вынікам дзейнасці нацыянальных эліт, але і знешнепалітычных праектаў такіх дзяржаў, як Францыя, Вялікабрытанія, Расія, Германія. Пытанні нацыябудаўніцтва і знешняй палітыкі цесна перапляталіся.

Красамоўна дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў у сферы міжнацыянальных адносін і на міжнароднай арэне адлюстроўвае дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта (МБК) – першай нацыянальнай арганізацыі беларусаў, якая была створана ў Магілёве вясной 1917 г. Аналіз яе статута, праграмных мэтаў і дзейнасці даказвае, што ў аснове была Беларуская нацыянальная ідэя. За час свайго існавання палітычныя погляды МБК эвалюцыяніравалі ад ідэі нацыянальнай аўтаноміі беларусаў да ўхвалення стварэння незалежнай Беларускай дзяржавы абумовіла цікавасць да знешняй палітыкі і дзейнасці ў сферы міжнародных адносін [1, с. 51–72].

Найперш грамадскія арганізацыі ў 1917 г. былі арыентаваны на ўдзел у агульнарасійскіх падзеях. МБК не быў выключэннем, бо рэвалюцыя парадзіла надзею на аб'яднанне беларускага народа на ўсёй тэрыторыі яго этнічнага рассялення ў складзе асобнай аўтаномнай адміністратыўнай



Репозиторий ВГУ

адзінкі са сваім органам улады, што павінна было паспрыяць нацыянальна-культурнаму адраджэнню беларусаў і росту дабрабыту насельніцтва Беларусі. Калектыўныя заявы і індывідуальныя выступленні яе сяброў, практычная дзейнасць МБК сведчылі пра шчырую зацікаўленасць у эканамічным і культурным прагрэсе краю, у здабыцці беларусамі годнага месца ў міжнародным супольніцтве народаў.

На з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый 25–27.03.1917 г. у Мінску асаблівай актыўнасцю вызначыўся адзін з лідараў МБК М. Кахановіч. Ён быў абраны ў склад агітацыйна-палітычнай і арганізацыйнай камісій, а таксама сакратарам адной з найважнейшых камісій з'езда – этнаграфічнай, якая займалася пытаннямі межаў Беларусі. Кахановіч быў абраны членам Беларускага Нацыянальнага Камітэта,і яго ўключылі ў склад дэлегацыі для перамоваў з прадстаўнікамі Часовага Ўрада Расіі [1, с. 18–20]. Часовы Урад меў з Камітэтам трывалыя сувязі, але канкрэтныя прапановы членаў камітэта не знайшлі падтрымкі ва ўрадавых колах.

У першыя месяцы існавання, пазіцыя магілёўскіх беларусаў была выключна памяркоўнай і па некаторых пытаннях не зусім акрэсленай. Чальцы камітэта заяўлялі пра тое, што Беларусь неабходна вылучыць у "самастойную адміністрацыйную адзінку", што кіраваць ёю павінны асобы "з асяроддзя самога насельніцтва Беларусі", для чаго трэба ўтварыць мясцовы заканадаўчы орган і дакладна размежаваць кампетэнцыю паміж ім і агульнадзяржаўнымі расійскімі органамі. Паступова погляды членаў МБК у 1917–1918 гг. істотна і хутка эвалюцыяніруюць – ад аўтаноміі да незалежнасці [6].

Прадстаўнікі МБК прымалі ўдзел у працы Першай Сесіі Цэнтральнай Рады Беларускіх арганізацый у Мінску 5–7.08.1917 г. Рада пастанавіла паслаць дэлегатаў у Кіеў на нараду (з'езд) "недзяржаўных народаў". Сярод іншых, дэлегаваўся адзін дэлегат ад Магілёва. З'езд народаў Расіі адбыўся 8–15.09.1917 г. у Кіеве па ініцыятыве Украінскай Цэнтральнай Рады. У ім бралі ўдзел прадстаўнікі грузінаў, літоўцаў, татараў, латышоў, эстонцаў, беларусаў, малдаванаў, данскіх казакаў, буратаў і яўрэяў. У прынятай рэзалюцыі з'езд выказаўся за "федэратыўнае ўпарадкаванне дзяржавы Расійскай" і ў якасці неадкладнай меры прапанаваў прыдаць статус аўтаноміі "вялікім краям, заселеным адной нацыянальнасцю". З'езд прыняў спецыяльную рэзалюцыю "Аб беларусах", якая ўтрымлівала зварот да Часовага ўрада з патрабаваннем выдаць дэкрэт "Аб аўтаноміі Беларусі ў межах Расійскай Дэмакратычнай Рэспублікі" з абавязковым далучэннем да аўтаноміі Беларусі захопленых ворагам тых мясцовасцей, у межах якіх былі расселены прадстаўнікі беларускага этнасу [6].

Магілёўскі Беларускі Камітэт актыўна далучыўся да падрыхтоўкі першага агульнанацыянальнага форуму беларусаў (Усебеларускага з'езду ў снежні 1917 г.). На Усебеларускім з'ездзе М. Кахановіч на адным з пасяджэнняў выступіў з заклікам не адкладваць справу самавызначэння: "бо за нас можа вырашыць Вільгельм ці польскія легіёны" [1, с. 48].



Рэпазіторый ВДУ

У гэты жа час ішоў працэс стварэння Польскай дзяржавы. У гэтым кантэксце даволі цікавай выглядае пазіцыя камандзіра І Польскага корпуса генерала І. Доўбар-Мусніцкага. З аднаго боку ён прыхільна ставіўся да самавызначэння беларусаў і да ідэі стварэння незалежнай БНР. З другога боку пасля таго як 12.03.1918 г., войскі корпуса занялі Магілёў на будынку ратушы была ўсталявана дошка аб аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Пазіцыя МБК у гэты перыяд не была вызначанай, у прэсе паведамлялі, што частка беларусаў прыхільна ставіцца да палякаў, а другая да расейцаў [7, арк. 275].

Улічваючы ваеннае становішча, спачатку стасункі з Германскім кіраўніцтвам у МБК былі памяркоўныя. У сувязі са з'явіўшыміся думкамі аб ліквідацыі ў Магілёве акруговага суда і некаторых губернскіх устаноў, а таксама далучэння акупаванай часткі Магілёўскай губерні ў судовым парадку да Мінскай губерні выканаўчы камітэт МБК 18.07.1918 г. пастанавіў хадатайнічаць перад германскімі акупацыйнымі ўладамі пакінуць у Магілёве губернскія ўстановы.

Патрыёты Магілёва, а гэта былі пераважна прадстаўнікі інтэлігенцыі, віталі спробы стварэння на Беларусі сваёй дзяржавы. Так, 5.04.1918 г. Язэп Варонка, старшыня Народнага Сакратарыяту і Народны сакратар Замежных спраў Беларускай Народнай Рэспублікі, пісаў з Менска ў Вільню Івану і Антону Луцкевічам: "... Незалежнасць – цяжкая і адветная праца, а сіл у нас мала... Учора ужэ завязалі стасункі з Магілёвам і там усё добра: земства, горад і магілёўская беларуская рада (галава Кахановіч) стояць за нас..." [3, с. 78].

Вельмі моцна на пазіцыі МБК паўплывалі ўмовы Брэсцкай мірнай дамовы (3.03.1918 г.) паміж Германіяй і РСФСР, змест дэкларацыі кайзера Германіі Вільгельма ІІ (23.03.1918 г.) аб прызнанні незалежнасці Літоўскай дзяржавы, у склад якой былі ўключаны і беларускія землі (Віленшчына, Гродзеншчына, Беласточчына), і абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (25.03.1918 г.). Па ініцыятыве МБК у Магілёве 31.03.1918 г. адбыўся сход прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, партый і ўстаноў мясцовага кіравання (прысутнічала каля 400 чал.) на якім амаль аднагалосна было падтрымана стварэнне БНР і прызнанне ўлады Беларускай Цэнтральнай Рады ў Мінску, як органа кіравання ў межах рассялення беларускага народа [1, с. 64–72]. У пачатку чэрвеня 1918 г. на пасяджэнні МБК былі пацверджана, што абвяшчэнне незалежнасці БНР правільнае і своечасовае [4, арк. 73–74 адв.].

Восенню 1918 г. нямецкія ўзброеныя фарміраванні рыхтаваліся да эвакуацыі з Магілёва. Рыхтаваліся да ад'езду і члены МБК. Жаданне эвакуіравацца было выклікана перш наперш страхам перад рэпрэсіямі з боку бальшавікоў. Асаблівую ролю тут сыгралі "віцебскія падзеі" – расстрэлы былых членаў Віцебскай беларускай рады. Захавалася "Большевицкое самоопределение народов" – ліст адчаю віцебляніна К. Хадкевіча



Рэпазіторый ВДУ

аб “разгону і разгрому рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый” у лютым 1918 г. бальшавікамі Віцебску. У лісце падрабязна апісваецца спробы чырвоных атрадаў рабаваць сабор і інтэнданцкія склады пад час наступлення немцаў, якому супрацьстаялі беларускія дружыны і “паўстанне народу”. За гэта беларускія арганізацыі былі абвінавачаны ў стварэнні белай гвардыі для паходу на савецкую ўладу, іх маёмасць, перапіска, бібліятэка былі разграблены, памяшканні занятыя. Шматлікія эмацыйныя паведамленні з Віцебску і іншых гарадоў падкантрольных Чырвонай арміі прымушалі членаў Магілёўскага камітэта асцерагацца не толькі за сваю маёмасць, але і за жыццё [2, с. 10–11].

Уражвае, што нягледзячы на падрыхтоўку да эвакуацыі Рада ад імя МБК пасылае пратэсты ўрадам Украіны і РСФСР у абарону самастойнасці і незалежнасці беларускай дзяржавы. У іх адзначаецца, што МБК на пасяджэнні ад 21 верасня 1918 г. пастанавіў давесці да ведама ўрада РСФСР і ўрада Украінскай дзяржавы, што арганізацыя лічыць апошні “дадатковы” дагавор паміж Расіяй і Нямеччынай парушэннем правоў беларускага народа на самавызначэнне, на незалежнасць і непадзельнасць Беларусі, што МБК пратэстуе супраць непрызнання правоў Беларускага народа на самастойнае дзяржаўнае існаванне [2, с. 12–13]. У выніку 30.09.1918 г. лісты пратэсту МБК трапілі праз генеральнага консула БНР ва Украіне Р. Базарэвіча (Кіеў) старшыні Надзвычайнай дэлегацыі Рады БНР А. Луцкевічу (Кіеў), а праз ліст Надзвычайнай дэлегацыі міністру замежных спраў Украіны і старшыні Расійскай мірнай дэлегацыі Х. Ракоўскаму (Кіеў) [3, с. 264; 4, арк. 1].

Старшыня Магілёўскай Беларускай Рады М. Кахановіч ужо ў Мінску 27.10.1918 г. звярнуўся да Народнага Сакратарыяту БНР з прапановай стварыць Лігу нацый народаў былой Расійскай імперыі дзеля супольных выступленняў на міжнародных форумах [3, с. 287].

Такім чынам, на прыкладзе адной грамадскай арганізацыі – Магілёўскага беларускага камітэта мы бачым спробы актыўнага ўдзелу падобных грамадскіх аб’яднанняў у міжнародных і міжнацыянальных справах. Сёння адозвы грамадскіх аб’яднанняў аб сваіх адносінах да складаных міжнародных праблем сталі звычайнай справай. Сто гадоў таму – гэта было новая справа, якая патрабавала пэўнай смеласці і вялікай адказнасці за лёс свайго народу. У самых неспрыяльных умовах грамадзянскай вайны, замежных акупацый, паслярэвалюцыйнай завірухі грамадскія аб’яднанні выступалі за права беларусаў самім арганізоўваць сваё жыццё, спрабавалі ўплываць на ўсталяванне межаў новых краін, на міжнародныя адносіны.

1. Агееў, А. Р. Фарміраванне і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта (1917–1918) : манаграфія / А. Р. Агееў, І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. – 292 с.
2. Агееў, А. Р. Эвакуацыя архіва Магілёўскага беларускага камітэта ў Вільню восенню 1918 года / А. Р. Агееў // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зборнік навуко-

Репозиторий ВГУ

вых прац удзельнікаў VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Магілёў, 26–27 чэрвеня 2013 г. / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў : УА “МДУХ”, 2013. – С. 9–13.
3. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. – Вільня – Нью-Ёрк – Прага : БІНІМ; Т-ва Беларускага пісьменства; Наша Ніва, 1998 – С. 1–850.
4. Ліст Беларускага Генеральнага Консула ва Украіне // Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (LVCA). – Фонд 582. Воп. 2. Спр. 9. Арк. 1.
5. Пратакол № 5 пасяджэння Выканаўчага камітэта МБР ад 5.06.1918 г. // БДАМЛМ. – Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 73–74 адв.
6. Пушкін, І. А. Дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта ў сферы міжнародных адносін (1917–1918 гг.) / І. А. Пушкін // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац VIII Міжнар. навук. канф. 26–27 чэрвеня 2013 г., г. Магілёў / уклад.: А. М. Бацюкоў, І .А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2013. – С. 302–310.
7. Пушкін, І. А. Магілёў і Магілёўшчына ў святле апублікаваных архіваў Беларускай Народнай Рэспублікі / І. А. Пушкін // Шляхі Магілёўскай гісторыі : зборнік навуковых прац / уклад.: І. А. Пушкін, В. В. Юдзін. – Могилёв : Мог. обл. типография им. С. Соболя, 2005. – С. 260–270.
8. Хроніка падзей да беларускіх газет // НАРБ. – Фонд 325. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 275.

## НА ПУТИ К СОТРУДНИЧЕСТВУ: 1918 ГОД В БЕЛОРУССКО-УКРАИНСКИХ ОТНОШЕНИЯХ

Н. Б. Щавлинский (Минск)

Падение царизма в России в феврале 1917 г., декларирование Временным правительством свобод (свободы слова, печати, собраний, вероисповедания) активизировали национально-освободительную борьбу многих народов, в том числе украинского и белорусского. Уже в марте на территории Украины под председательством ученого, профессора М. Грушевского сформировалась Украинская Центральная рада, которая 13 июня 1917 г. выпустила декрет («Первый Универсал Центральной Рады») о провозглашении «автономии Украины». В соответствии с Универсалом учреждалось правительство – «Генеральный секретариат» во главе с В. Виннеченко. Тем временем в октябре 1917 г. в Петрограде произошла революция, в результате чего в Киеве был создан Совет рабочих и солдатских депутатов как орган советской власти на территории Украины. Вместе с тем события в Петрограде стали дальнейшим стимулом для движения Украины к своей независимости. 7 (20) ноября 1917 г. Рада «Третьим универсалом» провозгласила образование Украинской Народной Республики [6, с. 167].

Несколько подобным образом происходило объявление Белорусской Народной Республики на территории Беларуси. Уже в марте 1917 г. белорусский национальный съезд заявил о своей поддержке «федеративного демократически-республиканского строя России, а также учредил Белорусский национальный комитет (БНК). В августе 1917 г. в Минске в силу различных обстоятельств вместо БНК (он не выступил против участия

Репозиторий ВГУ